Радыё Свабода

ПАЛІТЫКА

У Горадні работніцу «Гроднапрамбуду», якая выступала за страйк, выклікалі на допыт па крымінальнай справе

01 верасень 2020, 18:32

Радыё Свабода

У Горадні супрацоўніцу «Гроднапрамбуду» Юлію Сьліўко выклікалі на допыт у СК. Да яе дому прыходзілі невядомыя.

Юлію Сьліўко дапыталі ў Сьледчым камітэце ў якасьці сьведкі па крымінальным артыкуле 342 «Арганізацыя або падрыхтоўка дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак, або ўдзел у іх». Да таго ж яе выклікаюць у РАУС зь невядомай прычыны.

Па некалькіх ранейшых месцах жыхарства Сьліўко прыходзілі невядомыя людзі, прадстаўляліся суседзям праваахоўнікамі, зь якой прычыны шукалі жанчыну — невядома.

Сама Юлія расцэньвае такія дзеяньні як запалохваньне і ціск за сваю грамадзкую пазыцыю. Раней яна плянавала ўдзельнічаць у страйку на прадпрыемстве, выступала на мітынгу і ў СМІ. Сьліўко з сынам часова не жыве па сваім сталым месцы жыхарства, бо баіцца перасьледу.